**ЛАЗАВІ́К**, лясны дух, які жыве ў лазе (параўн. з *Лознікамі*). Нар. ўяўленне малявала яго старэнькім аднавокім карлікам, велічынёю не большым за пазногаць, аднак з доўгай аршыннай барадою і з доўгай, у сем сажняў, пугаю ў руцэ. Маленькі домік Л. акружаны балотамі, у ім няма ні вокнаў, ні дзвярэй — толькі маленькая адтуліна ў страсе, праз якую залазіць сам гаспадар. Дом Л. недаступны для людзей: пры набліжэнні чалавека ён увесь час аддаляецца ад яго. Калі Л. расхаджвае па балотах, яго адразу можна пазнаць: адзінае яго вочка бліскае, як агеньчык. Аналагічны ці блізкі міфалагічны персанаж быў вядомы ў беларусаў пад імем *Балотніка*, Вадовіка.

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1846. Прибавления. Кн. 4.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ